*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 7 (438) Аўторак, 14 сакавіка 1961 г. Цана 1 кап.

## *ЗА ТЫХ, ХТО ДАСТОЙНЫ ДАВЕР'Я*

19 сакавіка будуць галасаваць студэнты і выкладчыкі, рабочыя і служачыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Леніна. Сёння мы знаёмім нашых чытачоў з кандыдатамі ў дэпутаты Ленінскага раённага, гарадскога і абласнога Саветаў дэпутатаў працоўных, якія будуць балаціравацца па 11 выбарчых акругах.

Вось імёны нашых кандыдатаў.

### У РАЁННЫ САВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Ілья Афанасьевіч **Увараў** (выбарчая акруга № 78)—загадчык аддзела народнай асветы Ленінскага раёна. У 1927 годзе Ілья Афанасьевіч Увараў скончыў МГУ імя Ламаносава і пасля гэтага доўгія гады працуе на педагагічна-выхаваўчай рабоце. У 1943 годзе, будучы на фронце, тав. Увараў уступае ў партыю.

Мікалай Пятровіч **Марчанка** (выбарчая акруга № 79)—старшы інспектар Упраўлення прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства вышэйшай, спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР.

Сваю працоўную дзейнасць тав. Марчанка пачаў у у 1931 годзе. Мікалай Пятровіч Марчанка—член КПСС.

Тамара Ільінічна **Асененка,** сакратар Ленінскага РК КПБ, балаціруецца па выбарчай акрузе № 80. У 1951 годзе яна ўступіла ў рады Камуністычнай партыі, у 1958 годзе скончыла вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. У гады вайны Тамара Ільінічна была партызанскай разведчыцай і сувязной.

Ніна Паўлаўна **Галаванава** (выбарчая акруга № 81)—наменснік галоўнага ўрача 3-яй аб'яднанай клінічнай бальніцы.

Па 82, 83, 84-ай выбарчых акругах балаціруюцца беспартыйныя Тацяна **Кудзіна,** майстар пашыву жаночага плацця ў трыкатажным атэлье № 21; камсамолка Рэгіна Іосіфаўна **Смагаржэўская,** тэлеграфістка 10-га гарадскога аддзялення сувязі; Яўген Іванавіч **Ліліпчук,** удзельнік Айчыннай вайны, лепшы манцёр Мінскай радыётрансляцыйнай сеткі. Усе яны карыстаюцца заслужанай павагай у сваіх калектывах, перавыконваюць дзённыя і месячныя нормы на 120—130 працэнтаў.

### У ГАРАДСКІ САВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Вікторыя Іванаўна **Хімакова,** якая балаціруецца па выбарчай акрузе № 31, нарадзілася ў 1908 годзе. У 1932 годзе яна скончыла Мінскі медыцынскі інстытут. Доўгі час яна працавала ў дзіцячых установах аховы здароўя г. Мінска, затым у час вайны—участковым урачом у горадзе Саратаве і, нарэшце, у пасляваенныя гады—галоўным урачом Рэспубліканскай бальніцы лячэбна-санітарнага ўпраўлення. Вікторыя Іванаўна Хімакова—член КПСС с 1940 года. За самаадданую працу на карысць народа яна ўзнагароджана медалямі «За працоўную доблесць», «За доблесную працу ў Вялікую Айчынную вайну», значком «Выдатнік аховы здароўя». Неаднаразова выбіралася ў гарадскі Савет і апраўдвала давер'е выбаршчыкаў.

Екацярына Сямёнаўна **Курловіч** (выбарчая акруга № 32)—закройшчыца атэлье № 5 фабрыкі № 1 індывідуальнага пашыву. Тав. Курловіч беспартыйная, працавала кулінарам, краўчыхай, закройшчыцай. Добры спецыяліст, агітатар змены.

Ія Пятроўна **Цярпілоўская** (выбарчая акруга № 33) нарадзілася ў горадзе Віцебску, у 1908 годзе. Пасля сканчэння педагагічнага інстытута яна працуе ў школах Віцебскай вобласці, г. Віцебску, Навасібірскай вобласці, г. Мінску. Павагу і аўтарытэт заслужыла яна сярод педагагічнага калектыву чацвёртай сярэдняй школы, дзе ў сучасны момант выкладае хімію. Сапраўдны майстар сваёй справы, чулы таварыш, яна ахвотна дапамагае маладым педагогам.

### У АБЛАСНЫ САВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Ала Вікенцеўна **Ражкова** (выбарчая акруга № 3)—1936 года нараджэння, член ЛКСМБ. Нядаўна яна скончыла Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум і стала працаваць тэхнікам у Інстытуце прамысловага праектавання «Белпрампраект».

Зараз яна ўжо старшы тэхнік, вучыцца на 5-ым курсе вячэрняга аддзялення Мінскага палітэхнічнага інстытута. А. В. Ражкова нястомна павышае свае тэхнічныя веды, з'яўляцца актыўным грамадскім работнікам.

**Галасуйце за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных!**

# МЫ ПАВІННЫ ВЫХОЎВАЦЬ ЧАЛАВЕКА КАМУНІСТЫЧНАЙ БУДУЧЫНІ

## *З XV камсамольскай канферэнцыі*

5 САКАВІКА ў актавай зале корпуса гуманітарных навук адбылася XV камсамольская канферэнцыя. Дэлегаты абмяркоўвалі важнейшыя задачы камуністычнага выхавання моладзі.

З дакладам выступіў сакратар парткома ўніверсітэта **Р. В. Булацкі.**

Камсамольская арганізацыя нашага ўніверсітэта, сказаў дакладчык, дабілася некаторых поспехаў у справе паляпшэння ідэйна-выхаваўчай работы. А гэта спрыяла лепшай падрыхтоўцы спецыялістаў.

ВЫКЛЮЧНА важнае значэнне ў выхаванні моладзі мае вывучэнне гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, філасофіі, а таксама факультатыўных курсаў—асноў навуковага атэізму і марксісцка-ленінскай эстэтыкі. У большасці сваёй студэнты сур'ёзна вывучаюць грамадскія дысцыпліны. Дакладчык прыводзіць яскравыя прыклады, якія сведчаць аб глыбокіх ведах студэнтаў па гэтых прадметах. А вось шэсць студэнтаў трэцяга курса хімічнага факультэта атрымалі па палітычнай эканоміі нездавальняючыя адзнакі, двое не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын. Дрэнна адносяцца да вывучэння грамадскіх навук камсамольцы Высоцкі, Патапаў, Галоўкін, Сянкевіч. На жаль камсамольскія бюро мала пыталі з тых, хто недаацэньвае грамадскія навукі, не рыхтуецца да семінарскіх заняткаў. Ёсць і другія факты. Студэнты атрымлівалі выдатныя адзнакі па грамадксіх навуках, а калі справа даходзіла да з'ўлення на работу па накіраванню, яны ўхіляліся ад выканання гэтага абавязку перад дзяржавай. Такія факты сведчаць аб тым, што асобныя студэнты фармальна вывучалі марксісцка-ленінскую тэорыю, што яна не стала іх глыбокім асабістым перакананнем.

САМААДДАНАЯ праца на карысць грамадства валодае выключнай сілай выхаваўчага ўздзеяння на нашу моладзь, павышае камуністычную свядомасць, нараджае дух калектывізму. 113 440—такую лічбу называе дакладчык. Столькі рабочых гадзін адпрацавалі камсамольцы на будаўнічых аб'ектах Мінска і Салігорска. У верасні і кастрычніку студэнты ўніверсітэта аказалі калгасам і саўгасам вялікую дапамогу ва ўборцы ўраджаю. Але там, у калгасах і саўгасах, выявілася, што некаторыя нашы студэнты з пагардай адносяцца да фізічнай працы. Гэта асабліва датычыць студэнтаў рускага аддзялення. Напрыклад, Міцкевіч, Міхеева і іншыя сістэматычна ўхіляліся ад работы. «Вызначыліся» ў калгасе студэнты фізічнага факультэта. Яны дайшлі да таго, што ноччу абабралі сад у старэнькай бабулі.

Самаабслугоўванне ў інтэрнатах мае вялікае значэнне ў справе працоўнага выхавання студэнтаў. Дзяжурным давяраецца падтрыманне чысціні і парадку. Некаторыя студэнты, аднак, несур'ёзна адносяцца да гэтага. Так, студэнтка III курса матфака Сцяпанава адмовілася ўбіраць на кухні, а студэнтка гэтага ж факультэта Блохіна—мыць падлогу ў калідоры.

Член камсамольскага бюро III курса фізічнага факультэта Кабашнікаў разам з камсамольцамі з 65 пакою, дзе яны жывуць, не захацеў убіраць на кухні. «Не наша, маўляў, справа—уборка, мы прыехалі сюды не для таго, каб пэцкаць рукі». Кабашнікаву і іншым жыхарам 65-га пакою была аб'яўлена строгая вымава.

Камсамольскім арганізацыям трэба павесці рашучую барацьбу з гультаямі, з тымі, хто звысоку глядзіць на фізічную працу.

ГАЛОЎНАЯ наша задача—вучыцца на «добра» і «выдатна». Люстэркам нашай вучобы з'яўляецца сесія. Што ж паказала прайшоўшая зімовая сесія? Здалі экзамены на «выдатна» 393 студэнты, на «добра» і «выдатна»—1015, на «здавальняюча»—1326. Нездавальняючыя адзнакі атрымалі 193 студэнты.

Самая нізкая паспяховасць на фізічным і матэматычным факультэтах і на трэцім курсе аддзялення рускай мовы і літаратуры, дзе з 48 здаваўшых экзамены дванаццаць студэнтаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

У чым жа прычына? Гавораць, што на фізічным і матэматычным факультэтах цяжка займацца. Гэтыя сцвярджэнні не вытрымліваюць ніякай крытыкі. Праверка паказала, што на некаторых лекцыях па матэматычных дысцыплінах адсутнічала да паловы студэнтаў. А першакурснік матфака Макарэвіч амаль ніводнага разу не з'явіўся на першыя гадзіны заняткаў.

Шмат заняткаў прапускаюць Буткевіч, Маскалёнак, Шатан, Іваніцкая, Галоўкін, Сянкевіч (філфак), Паструхіна, Дзікаленка, Худзякоў (фізфак), Чычык, Дударчык (матфак), Вакула (юрфак) і іншыя.

Усяго ва ўніверсітэце за першы семестр прапушчана без уважлівых прычын 3.545 гадзін. Як правіла, недысцыплінаваныя студэнты дрэнна вучацца.

Нашы студэнты не толькі вучацца самі, але вучаць і іншых. Камсамольцы аказваюць дапамогу рабочым, якія займаюцца ў вячэрніх школах, праводзяць заняткі на падрыхтоўчых курсах. На такіх курсах пры аўтазаводзе вучыцца 200 чалавек, на камвольным камбінаце—60, у будтрэсце № 5—56.

ВЯЛІКУЮ ролю ў выхаванні студэнтаў павінен адыгрываць наш друк. Зараз ва ўніверсітэце выпускаецца больш 40 насценных газет. Шматтыражка «Беларускі ўніверсітэт» апублікавала рад матэрыялаў аб рабоце нашых студэнтаў на будаўніцтве галоўнага корпуса, у калгасах. Але газета яшчэ недастаткова асвятляе камсамольскае жыццё, лепшы вопыт камсамольскай работы.

Вельмі рэдка выпускаюцца насценныя газеты ў інтэрнатах. Камітэту камсамола трэба было ўжо даўно зацвердзіць склад рэдкалегіі газеты «Старт», якая да гэтага часу выпускаецца з вялікімі цяжкасцямі.

У дакладзе Р. В. Булацкага быў закранут яшчэ шэраг важных і актуальных пытанняў, вырашэнне якіх будзе спрыяць паляпшэнню ідэйна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў універсітэта.

### НА ПЕРШЫ ПЛАН—ПАЛІТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

Пасля перапынку дэлегаты распачалі спрэчкі па дакладу тав. Булацкага. Першым выступае студэнт фізфака **Салаў.**

— На першы план,—гаворыць Салаў,—у нас павінна быць пастаўлена палітычнае выхаванне моладзі. Узяць, напрыклад, такі факт. Мінулай восенню наша група працавала ў калгасе «Камінтэрн». Папрацавалі мы добра, з душой, як гаворыцца. Тыя лічбы, якія ўпамянуты ў дакладзе тав. Булацкага, яскрава сведчаць аб тым, што большасць студэнтаў універсітэта працавала ў калгасах сумленна. Яны заслужылі гэтым самым падзяку ад калгаснікаў, ад праўленняў тых сельгасарцелей, дзе знаходзіліся. Аб нашай групе, у прыватнасці, вельмі цёпла адазваліся ў калгасе «Камінтэрн».

На такіх фактах, працягвае дэлегат, выхоўваецца наша моладзь. Працалюбівая, жыццёрадасная, яна заўсёды знаходзіцца там, дзе цяжэй.

Але ёсць сярод нас яшчэ людзі, якіх не турбуюць хваляванні калектыва. Яны ў першую чаргу клапоцяцца аб сваіх асабістых мяшчанскіх выгадах, шукаюць нейкіх цёплых мясцін. Для іх не існуе высокай камуністычнай маралі, пачэсных абавязкаў кожнага камсамольца, маладога спецыяліста. Так, дзесяць выпускнікоў фізфака не паехалі працаваць на месца назначэння, засталіся пад цёплымі крыльцамі пап і мам, ідзе не працуюць, або працуюць не па спецыяльнасці. А ўсяго па ўніверсітэту такіх людзей было 87. Не месца тунеядцам сярод здаровага камсамольскага калектыва!

### КОЖНАМУ КАМСАМОЛЬЦУ—ДАРУЧЭННЕ

Уважліва слухаюць дэлегаты выступаючых. Адзін за другім падымаюцца яны на трыбуну. Вось на трыбуне студэнт II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры **Іскрык.** Камсамолец дзеліцца вопытам сваёй работы. Будучы камсоргам групы, ён імкнецца арганізаваць яе так, каб кожнаму камсамольцу было дадзена якое-небудзь грамадскае даручэнне. А іх нямала можа быць. Адны камсамольцы могуць правесці палітінфармацыі, другія—арганізаваць культпаходы, трэція выступяць з дакладамі і г. д.

— Выконваючы камсамольскае даручэнне,—гаворыць прамоўца,—камсамолец расце сам. Узрастае свядомасць, пашыраецца кругагляд, выхоўваецца пачуццё адказнасці за даручаную справу.

### ЯНЫ ТАКСАМА БУДУЦЬ КАМСАМОЛЬЦАМІ

Дзень, калі праходзіла канферэнцыя, выдаўся нарэдкасць сонечным і цёплым.

Як быццам яшчэ цяплейшай стала атмасфера, калі ў залу ўвайшлі піянеры. Яны віталі канферэнцыю. Дэлегаты сустракаюць школьнікаў апладысментамі. На чале піянераў лепшая важатая ўніверсітэта Вольга Шаўчэнка. Піянеры запэўнілі камсамольцаў, што яны зробяць усё, каб быць падобнымі на сваіх старэйшых таварышаў. Камсамольцы ў сваю чаргу абавязаліся больш часцей бываць у школьнікаў.

### УМАЦУЕМ НАШУ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

Пасля крытычнага выступлення студэнта філфака **Рэкуца** ў адрас работы студкома інтэрната № 1, выступіў дэлегат гістарычнага факультэта **Лашчынін.**

— Універсітэт мае ўсе магчымасці,—гаворыць ён,—каб мець багатую, разнастайную мастацкую самадзейнасць. Нам трэба стварыць такую самадзейнасць, якая змагла б на будучых аглядах займаць першыя месцы.

— У прыватнасці, нам трэба падумаць аб стварэнні добрага эстраднага аркестра, умела падабраць яго рэпертуар.

### МОЛАДЗЬ РОБІЦЬ ЦУДЫ

Аб маральным вобліку савецкага студэнта гаварыў сакратар гаркома ЛКСМБ тав. **Сенюць** і іншыя выступаўшыя.

На трыбуну падымаецца рэктар БДУ, прафесар Антон Нікіфаравіч **Сеўчанка.**

— Наша моладзь,—з гордасцю гаворыць ён,—узброена самымі перадавымі ў свеце ідэямі, светапоглядам. На розных франтах працоўнай дзейнасці заўсёды была ў першых радах будаўнікоў камунізма. Такой яна застаецца, прышоўшы ў ВНУ. У інстытуце або ўніверсітэце іншае поле дзейнасці, але мэта застаецца адна: сваёй выдатнай і добрай вучобай моладзь памнажае слаўныя традыцыі Ленінскага камсамола.

А. Н. Сеўчанка спыняецца на паводзінах асобных студэнтаў, якія ганьбяць нашу дружную камсамольскую сям'ю. Камсамол павінен аб'явіць ім самую бязлітасную, жорсткую барацьбу,—гаворыць прафесар Сеўчанка.

* * *

XV камсамольская канферэнцыя прыняла разгорнутую рэзалюцыю, у якой намечаны канкрэтныя шляхі паляпшэння ідэйна-выхаваўчай работы.

Дэлегаты абралі ў склад камітэта камсамола новых таварышаў.

**Матэрыялы з канферэнцыі падрыхтавалі У. ПАНЕЎ, М. КАЗАКЕВІЧ, А. ЗАЛЕЎСКІ.**

# СУПРАЦЬ КУЛЬТУ АДЗНАКІ

*Нядаўна ў газеце «Известия» быў надрукаван артыкул прафесара Кудраўцава, у якім закрануты некаторыя важныя пытанні работы вышэйшай школы. Сёння мы змяшчаем артыкул-водгук прафесара Г. Г. Вінберга і запрашаем нашых чытачоў выказацца па гэтаму пытанню.*

**У апошні час пры абмеркаванні пытанняў вышэйшай адукацыі на старонках «Известий», «Правды» і іншых газет не раз выказваліся слушныя заўвагі. Тым не менш, многія набалеўшыя пытанні жыцця вышэйшай школы заставаліся ў баку.**

**Нарэшце і яны былі прапанаваны да абмеркавання ў артыкуле прафесара Кудраўцава «Праверка на ...вынослівасць» («Известия» ад 25 лютага 1961 года). Зусім правільна, што краевугольны камень усёй вузаўскай сістэмы адукацыі—існуючы парадак правядзення экзаменацыйнай сесіі, па выніках якой назначаюцца стыпендыі, — мае патрэбу ў рашучых рэформах. Правільна і тое, што неабходна рэзка скараціць колькасць экзаменаў і залікаў, і адказацца ад назначэння стыпендыі па паспяховасці.**

**Шкода ад гэтага парадку —вялізарная. Ён не можа быць апраўданы нічым — ні з выхаваўчага, ні з педагагічнага, ні з маральнага боку, і зараз не садзейнічае, а перашкаджае паспяховай падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.**

**Мала знаёмыя з сутнасцю справы любяць гаварыць, што дзяржава не абавязана і не павінна ўтрымліваць непаспяваючых і лодыраў. Гэта правільна, але ніякіх адносін да парадку назначэння стыпендыі не мае. Студэнт, які атрымаў адну, нават дзве «тройкі »ці не здаў адзін экзамен таму, што не разлічыў свае сілы, ці таму што, да жаху ханжы, захапіўся ў перыяд сесіі чым-небудзь альбо кім-небудзь, — не абавязкова безнадзейны гультай, якога трэба аштрафаваць у размеры паўгадовай стыпендыі.**

**Кожны педагог ведае, колькі, у канчатковым выніку, карысці атрымлівае студэнт, калі яму здарыцца спачатку «праваліць» прадмет, чым калі ён, недастаткова падрыхтаваўшыся, шчасліва «праскочыць» на экзамене. Педагог павінен атрымаць шырокую свабоду ставіць нездавальняючую адзнаку, карыстацца ёю як адной з важных выхаваўчых мер. Пры існуючым парадку назначэння стыпендыі і вядзенні экзаменацыйнай сесіі ён фактычна пазбаўлены гэтай магчымасці, таму што не мае неабходнай свабоды дзеянняў і не можа не лічыцца з тым, што паставіўшы «нездавальняюча», ён заводзіць некаторых студэнтаў калі не ў бязвыхаднае, то ў вельмі цяжкае становішча.**

**Што ж датычыць тых студэнтаў, якія нягледзячы на неабходную дапамогу, па тых ці іншых прычынах не могуць быць у ліку паспяваючых, то з такімі справа простая — ім не месца ў ВНУ. ? гэта пытанне намнога лягчэй і правільней будзе рашацца, калі ад адзнакі не будзе залежыць стыпендыя. Вядома, што фонды стыпендый адпускаюцца ВНУ незалежна ад паспяховасці, так што да фінансавага боку справы парадак назначэння стыпендыі адносін не мае.**

**Другое пытанне, паднятае прафесарам Кудраўцавым, — аб перагрузцы студэнтаў і выкладчыкаў абавязковымі лекцыямі — таксама мае кардынальнае значэнне. Рэзкае скарачэнне гадзін абавязковых заняткаў па ўсіх прадметах — спецыяльных і грамадскіх — будзе толькі садзейнічаць глыбокаму засваенню галоўнага, адкрые шлях да найбольш плённых форм самастойнай работы студэнтаў і дасць магчымасць выкладчыку ўдзяліць патрэбную ўвагу навукова-даследчай і метадычнай рабоце. Іншага шляху няма.**

**Безумоўна, прывычнае многім здаецца непазбежным і правільным, а многіх задавальняе і тое, што «згодна дзеючых інструкцый» усё проста і зручна — «схапіў» студэнт двойку —няма стыпендыі, «пранесла» на экзамене — атрымлівай яе на паўгода. Напэўна, знойдуцца і іншыя абгрунтаванні старога парадку і пярэчанні супраць прапаноў прафесара Кудраўцава, якія мне, на аснове трыццацігадовага вопыту выкладання, здаюцца цалкам правільнымі і заслугоўваючымі ўсямернай падтрымкі.**

Праф. Г. Г. ВІНБЕРГ.

# Барацьба за веды—галоўны напрамак

## (З партыйнага сходу гістарычнага факультэта)

Падрыхтоўваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, адданых справе пабудовы камуністычнага грамадства—такая задача стаіць перад вышэйшай школай.

Аб гэтым ішла размова на адбыўшымся нядаўна адкрытым партыйным сходзе гістарычнага факультэта.

Дакладчык, дэкан факультэта П. З. Савачкін, адзначыў, што вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі бягучага вучэбнага года радуюць партыйную арганізацыю і дэканат.

— Гэта вынік таго,—гаворыць дакладчык,—што, працуючы другі год па новаму вучэбнаму плану, камуністы правільна зразумелі патрабаванні, якія выцякаюць з Закона «Аб палягшэнні сувязі школы з жыццём і далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў краіне», і разгарнулі барацьбу за трывалыя веды. У зімовую экзаменацыйную сесію мінулага вучэбнага года на «выдатна» і «добра» здалі крыху больш паловы камуністаў, а чацвертая частка на «нездавальняюча», а ў бягучым вучэбным годзе за гэты перыяд колькасць камуністаў, добра здаўшых сесію, значна ўзрасла, і зусім не было непаспяваючых.

Многія камуністы сталі выдатнікамі вучобы. Сярод іх—Міхаіл Жаркоў, Эдуард Лейкін, Марыя Ключнікава, Пётр Шпак, Мікалай Васін і іншыя. Перадавая роля камуністаў у вучобе, іх арганізатарская работа далі магчымасць рэзка павысіць паспяховасць усіх студэнтаў. Аб гэтым яскрава гаворыць той факт, што лік непаспяваючых студэнтаў даведзен да мінімума.

За апошнія два гады стала больш увагі ўдзяляцца педагагічнаму цыклу дысцыплін, што мае вялікае значэнне для падрыхтоўкі настаўнікаў-гісторыкаў для сярэдніх школ. Павялічэнне ліку гадзін па гэтых дысцыплінах дало добрыя вынікі ў паспяховасці студэнтаў. Доказам гэтага з'яўляюцца вынікі экзаменаў па псіхалогіі ў трэццякурснікаў і папярэднія даныя педагагічнай практыкі студэнтаў чацвёртага курса ў сярэдніх школах.

На факультэце добра пастаўлена культурна-масавая, фізкультурная і абаронная работа. Гэтыя поспехі не прышлі самі па сабе. Яны дасягнуты ў выніку напружанай работы партыйнай і камсамольскай арганізацыі і прафесарска-выкладчыцкага складу.

Аднак, нягледзячы на поспехі нельга не адзначыць, што на факультэце ўсё яшчэ ёсць сур'ёзныя недахопы.

— Перш за ўсё,—адзначае дакладчык,—выклікае сур'ёзную заклапочанасць вячэрняе аддзяленне і асабліва першы курс, дзе з 25 чалавек 7 маюць па адной—дзве нездавальняючыя адзнакі. Бюро партыйнай арганізацыі і кафедры факультэта выпусцілі з свайго поля зроку работу на вячэрнім аддзяленні. Неабходна глыбока вывучыць прычыны склаўшагася становішча і прыняць тэрміновыя меры па ліквідацыі недахопаў.

Недаравальна, што асобныя студэнты прапускаюць шмат лекцый без уважлівых прычын. Аднак партыйныя групы і камсамольскія арганізацыі курсаў усё яшчэ мірацца з такім становішчам і слаба прыцягваюць парушальнікаў да адказнасці. Вялікую трывогу вызываюць выпадкі п'янства сярод студэнтаў. Так, пяцікурснікі Анісімаў і Дылевіч учынілі п'янку і дэбош, наклалі сваім учынкам брудную пляму на факультэт. Гэта вынікі таго, што камсамольская арганізацыя факультэта прыкрываецца агульнымі поспехамі і не цікавіцца запатрабаваннямі кожнага члена камсамола, не выхоўвае ў іх свядомасці камуністычную мараль.

Праверкі паказваюць, што недастаткова працуюць выкладчыкі ў сваіх групах. Між тым, умелая работа выкладчыка ў групе спрыяе павышэнню паспяховасці і паляпшэнню дысцыпліны. Напрыклад, выкладчык кафедры старажытнай гісторыі В. А. Мельцэр за кароткі тэрмін змог аб'яднаць студэнтаў другога курса ў боездольны калектыў. Студэнты бачаць у ім старэйшага таварыша, прынцыповага педагога, заўсёды звяртаюцца да яго за парадай і дапамогай. І як вынік, другі курс з'ўляецца самым арганізаваным на факультэце.

Ідзе другі семестр. Якія задачы стаяць перад партыйнай арганізацыяй у цяперашні час? Папершае, патрэбна замацаваць дасягнутыя поспехі. Неабходна ўзмацніць кантроль за падрыхтоўкай студэнтаў да практычных і семінарскіх заняткаў, праводзіць іх на высокім ўзроўні.

Кафедры і СНТ абавязаны карэнным чынам палепшыць навукова-даследчую работу ў гуртках.

Перад гістарычным факультэтам стаіць задача рыхтаваць не толькі настаўнікаў-гісторыкаў, але таксама музеезнаўцаў і археолагаў. У гэтым напрамку ў нас работы—непачаты край. Перш за ўсё даўным-даўно надыйшла неабходнасць у арганізацыі новай кафедры—археалогіі, этнаграфіі і дапаможных дысцыплін. І чым хутчэй гэта будзе зроблена, тым лепш.

Пасля даклада разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Дацэнт Ф. М. Нечай многа ўвагі ў сваім выступленні ўдзяліў пытанню паспяховасці на вячэрнім аддзяленні, зрабіў рад прапаноў па выпраўленню становішча. Ён падкрэсліў, што на факультэце яшчэ нездавальняюча пастаўлена навукова-даследчая работа па тэматыцы гісторыі старажытнага свету. Гэта вынік таго, што кафедра звязана толькі са студэнтамі першых курсаў.

Дацэнт А. І. Сідарэнка адзначыў, што работу выкладчыкаў у замацаваных групах ніхто не абагульняе, не пашырае лепшыя і апраўдаўшыя сябе формы. А ў гэтым даўно ёсць неабходнасць.

У спрэчках таксама выступілі тт. Кузняцоў, Мантураў, Галкоўскі, Фрыдман, Арцёменка, Атрошчанка і інш.

У прынятай пастанове намечаны канкрэтныя шляхі вырашэння задач, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй у другім семестры.

Н. КАЯН.

# КОНКУРС на лепшую ПЕСНЮ

**Восенню мы будзем адзначаць слаўнае свята—40-годдзе з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна.**

**З універсітэта выходзяць фізікі і географы, матэматыкі і філолагі, хімікі і журналісты. Іх кліча жыццёвая дарога, нязведаныя далі, іх кліча будучае, поўнае цікавых спраў. Іх чакае любімая работа, творчыя дзярзанні, здзяйсненні. І на ўсё жыццё застануцца ў памяці непаўторныя гады студэнцкага юнацтва, вясёлыя песні.**

**У сувязі са святкаваннем 40-годдзя БДУ грамадскія арганізацыі ўніверсітэта аб'яўляюць конкурс на лепшую песню аб студэнцкім жыцці—вучобе, працы і адпачынку.**

**Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны прэміямі:**

**першая 15 рублёў,**
**другая—10 рублёў,**
**трэцяя—5 рублёў.**

**Паступіўшыя на конкурс песні будуць надрукаваны ў ў газеце «Беларускі ўніверсітэт».**

**ПРАФКОМ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**

Вечаслаў КАПЦІЛОВІЧ

З ДЗЁННІКА ТУРЫСТА

# Сярод шумлівых лясоў і азёр

**(Пачатак у №№ 5, 6)**

**26** *СТУДЗЕНЯ*

*Наш лыжны «рамонтнік» Віктар Сіўчык і Валеры Снапко ў школьнай майстэрні надзейна адрамантавалі лыжы. Мы правялі са школьнікамі гутарку, падзякавалі дырэктару за цёплы прыём, а ён нас—за змястоўныя выступленні перад вучнямі. Валеры Пракошын, кіраўнік групы, пазваніў дырэктару Дзвінскай сярэдняй школы, што ў тры гадзіны мы прыбудзем у іх населены пункт.*

*Выйшлі за вёску. Дарога ўвайшла ў лес... Па лесе ісці цікава. Запах соснаў прыемна бадзёрыць, а цудоўныя лясныя пейзажы песцяць позірк. Змейкай уецца дарога сярод высокіх дрэў і густых зараснікаў, але вось яна раздвайваецца. Куды ісці? Спыніліся, параіліся і рашылі выслаць у разведку Валерыя Пракошына і Валерыя Снапко. Астатнія ў гэты час пачалі чарціць на снезе якіясьці схемы і па іх меркаваць, куды дарога вядзе. Меркаванні былі розныя і за іх дакладнасць ніхто не паручаўся. Разведчыкі яшчэ не прышлі і мы спакойна адпачывалі. А лес шуміць і шуміць, задуменна і сумна, быццам скардзіцца на свае гаротнае, бабылёвае жыццё. Хоць бы адна птушка нарушыла сваім шчабятаннем яго задуменную жальбу. Яны пакінулі лес, паляцелі ў цёплыя краіны. Магчыма, пагэтаму сумуе стары лес, а можа ён успамінае радаснае жыццё ў летні час, калі яго напаўнялі сваімі спевамі вясёлыя птушкі. О, калі б хто мог зразумець тую чараўнічую мову, якую вядуць паміж сабой бабулькі-сосны, ён многа пачуў бы казачных гісторый! Ціха, спакойна і маркотна вядзе свой сумны расказ зімовы лес.*

*Прыйшлі абодва Валерыі, і не адзін з іх нічога пэўнага не даведаўся аб сваім шляху: усюды быў лес, а больш нічога не бачна і не чутна. Рашылі ісці па больш пратаптанай сцяжынцы. Ішлі доўга, пакуль не выйшлі на бераг якойсьці вялікай ракі. Завярнулі направа. Уперадзе паказаліся збудаванні нейкага пасёлка. Асцярожна перайшлі шырокую раку: месца незнаёмае і таўшчыня лёду таксама невядома якая, увайшлі ў гарадок. Аказалася, што мы перайшлі Дзвіну і п[illegible] тэчка Дзісну, толькі далі вялізарны круг па лесе.*

*Ля школы, прыгожага цаглянага будынка, нас чакала талака школьнікаў. Калі ўбачылі нас, яны з крыкамі «ідуць, ідуць», кінуліся ў школу. Адтуль выйшла яшчэ больш вучняў і настаўнікаў.*

*Шчырай была сустрэча. Мы расказалі аб сваіх уражаннях, аб універсітэце, якому восенню споўніцца сорак гадоў, аб развіцці навук, літаратуры, мастацтва. Школьнікі папрасілі нас сфатаграфавацца з імі. Яны сказалі, што гэтае фота папоўніць экспанаты школьнага музея. Дырэктар школы Бандарэвіч Аркадзій Васільевіч пазнаёміў нас са школай, паказаў выстаўку работ гуртка «Умелыя рукі», краязнаўчы музей, расказаў аб вучэбных і спартыўных гуртках, якія ёсць у школе. Гурток юных турыстаў заняў першае месца ў раёне, за што РайАНА прэміявала яго новым турысцкім снаражэннем. Многа цікавага мы даведаліся аб гісторыі маляўнічага мястэчка Дзісна. Мы так пасябравалі з вучнямі, што яны вечарам дружна дапамагалі нам уладкоўвацца ў адным з пакояў школы на начоўкі.*

**27** *СТУДЗЕНЯ*

*Прыйшлі ў вёску Туркова. Вучні са школы ўжо разышліся па дамах. Застанавіліся ў адным з класаў. Каб не сумаваць, правялі сход, на якім прысвоілі нашай турысцкай групе назву і выпусцілі насценгазету. Асабліва дасціпнымі былі заметкі: «Лепш есці, чым быць галодным», «За культурную начоўку», «Беражы лыжы», у якой указвалася, каб зберагчы лыжы: насі іх ў руках, не кладзі лыжню па голаму асфальту. Насмяяліся ўдосталь—весялосць жа характэрная рыса турыстаў.*

*Вечарам да нас прышло некалькі дзесяцікласнікаў. Мы з імі згулялі ў шашкі, а затым школьны вартаўнік доўга і цікава расказваў аб тым, як мясцовыя жыхары змагаліся з фашысцкімі захопнікамі, пра баі на Дзвіне.*

**28** *СТУДЗЕНЯ.*

*Раніцай правялі сустрэчу з туркоўскімі школьнікамі, а ў тры гадзіны дня ўжо выступалі ў Міёрскай сярэдняй школе. З захапленнем слухалі дзесяцікласнікі наш расказ аб гісторыі ўніверсітэта, аб вучобе і грамадскай дзейнасці студэнтаў. Пасля выступлення вялікая група школьнікаў прыйшла да нас у пакой, дзе мы спыніліся. Доўга мы гутарылі з імі, адказвалі на пытанні. Вечарам да нас прыходзілі міёрскія працаўнікі, цікавіліся ўмовамі паступлення ва ўніверсітэт. Завочнік фізічнага факультэта прасіў даць кансультацыю. Валерый Снапко ахвотна зрабіў гэта.*

*Доўга мы гулялі па міёрскіх вуліцах. Раённы цэнтр Міёры—невялікі акуратны гарадок, размешчаны на беразе возера, за якім пачынаецца лес. Нядаўна тут пабудаваны прыгожы цагляны будынак школы, заканчваецца будаўніцтва дома культуры, з помнікаў архітэктуры прыцягвае ўвагу сваёй стройнасцю і манументальнасцю касцёл, які пабудаваны ў XVII стагоддзі.*

**(Заканчэнне будзе).**

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:

**Мінск,**
**Універсітэцкі гарадок,**
**біякорпус, 31.**
**Тэлефон: 2-07-19.**
**Друкарня выдавецтва**
**БДУ імя У. І. Леніна.**

АТ 02178. Зак. 740.